## АФІЦЫЙНА-ДЗЕЛАВЫ СТЫЛЬ

Афіцыйна-дзелавы стыль – адзін з функцыянальных стыляў беларускай літаратурнай мовы, які абслугоўвае сферу пісьмовых афіцыйна-дзелавых зносін, выкарыстоўваецца ў справаводстве і дакументах. Асноўная мэта зносін – унармаванне афіцыйных і справавых узаемадачыненняў паміж людзьмі і ўстановамі. А.-дз. с. мае наступныя стылявыя рысы − афіцыйнасць, строгая дакладнасць, інфармацыйнасць, сцісласць, канкрэтнасць, адназначнасць, адсутнасць эмацыянальнасці, аб'ектыўнасць, паслядоўнасць у выкладзе матэрыялу, шаблоннасць і трафарэтнасць, высокі ўзровень стандартызацыі.

Для А.-дз. с. характэрна спецыфічнае выкарыстанне моўных сродкаў. На *лексічным узроўні*: ужыванне тэрмінаў і спецыфічных слоў, слоў у прамым значэнні, абрэвіятур і складанаскарочаных назваў, моўных штампаў, наяўнасць лексічных паўтораў;

на *марфалагічным узроўні*: шырокае выкарыстанне інфінітываў, дзеясловаў цяперашняга часу, расшчапленне выказніка (дзеяслоў + назоўнік *весці перапіску, займаць жылплошчу*), ужыванне аддзеяслоўных назоўнікаў, назоўнікаў са зборным значэннем, найменняў людзей па іх прафесіі або спецыяльнасці, парадкавых лічэбнікаў са склонавымі канчаткамі;

на *сінтаксічным узроўні*: выкарыстанне апавядальных сказаў, ускладненых аднароднымі і адасобленымі членамі, складаных сказаў, пасіўных канструкцый, прамы парадак слоў у сказе.

Адрозніваюць тры падстылі А.-дз. с. – уласна заканадаўчы, дыпламатычны, адміністрацыйна-канцылярскі. А.-дз. с. рэалізуецца ў дакументах розных жанраў, якія абагульняюць тыповыя сітуацыі афіцыйна-дзелавых адносін (закон, указ, статуты, нота, камюніке, пагадненне, дзелавыя паперы − заява, характарыстыка, аўтабіяграфія, даверанасць і іншыя).

### Літаратура


1. Асновы культуры маўлення і стылістыкі: Вучэб. дапам. / пад рэд. У.В. Анічэнкі. Мінск, 1992.
2. Каўрус А.А. Стылістыка беларускай мовы. Мінск, 1992.
3. Юрэвіч А.К. Стылістыка беларускай мовы: Вучэб. дапам. Мінск, 1992.


*Т.Л. Чахоўская*